Толькі пасля кніг наймудрасці Скарына пераходзіць да выдання (1518—1519 гг.) Старэйшых прарокаў і крыху пазней — Пяцікніжжа, важнейшых частак Св. Пісання. Паміж імі Скарына ў розны час выдае кнігі Юдзіф, а таксама Кнігу прарока Даніїла, быццам робячы спробы выдаць іудзейскае Пісанне да канца. Але ні кніг Ездры і Неемії, ні кніг Хронікі сярод яго спадчыны невядома. Таксама як і кніг Малодшых прарокаў. Справа ў тым, што захавалася некалькі рукапісных кодэксаў (ануфрыеўскі 1575—1577 гг., які ў XIX ст. быў падзелены на дзве часткі, што захоўваюцца зараз у Львове і С.-Пецярбурзе, і недатаваны віленскі (XVI ст.), з тэкстам Малодшых прарокаў), дзе копіі вядомых біблейскіх кніг Скарыны (перапісаныя нават з яго прадмовамі) суседнічаюць з тымі кнігамі, якія ў яго выданні невядомыя. Гэта прымушае меркаваць, быццам Скарына выдаў увесь Стары Запавет (напрыклад, так прапаноўвалі А.Алексютовіч, Я.Неміроўскі, Г.Галенчанка і інш.). Але мова і пераклад не скарынавых кніг у гэтых кодэксах дэталёва нікім не даследаваліся. П.Уладзіміраў, які знаёміўся з імі, схіляўся да думкі, што яны перакладаліся з чэшскай версіі. Ва ўсялякім выпадку, стыль фрагментаў прадмоў да кніг Малодшых прарокаў у ануфрыеўскім кодэксе яўна не скарынаўскі; напісаны ж яны старабеларускай мовай з моцным уплывам заходнеславянскага сінтаксісу.

**А.А.Яскевіч**, ст. навуковы супрацоўнік
Інстытута літаратуры
Нацыянальнай акадэміі навук

## МАРЫЯЛАГІЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ КНІЖНАСЦІ XVII СТ.

Сярэдневяковая свядомасць вызначалася тэацэнтрычным характарам: аснову анталогіі складаў крэацыянізм з яго вучэннем пра стварэнне Сусвету, гуманітарныя ж веды спасцігалі сутнасць **аб'явення** (адкравення, адкрыцця), падараванага чалавецтву Богам.

Сярэдневяковае мастацтва (і старабеларускае ў прыватнасці) спрадвеку імкнулася пазбавіць чалавека "звярынага аблічча", усеўладдзя ніжэйшых, біялагічных пачаткаў. Гэтым і вытлумачваецца духоўны, у значнай ступені аскетычны, змест старабеларускай кніжнасці, якая абвяшчала свайму народу і Сусвету невычэрпную радасць чалавечага існавання. Старабеларускае мастацтва рашуча адмаўляла не толькі таталітарна-прагматычныя, жорсткія адносіны да якога-небудзь народа, права на яго фізічнае вынішчэнне, духоўна-культурную асіміляцыю з-за нейкіх імгненных геапалітычных выгод і ідэалагічных канцэпцый, не дазвалялася



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нават прычыняць моцную крыўду, знішчаць ніжэйшых істот, жывёл і птушак (лічылася, што душа іх няспынна моліцца, услаўляе Бога).

Усё нацыянальнае ўводзілася ў Храм Божы, прасвятлялася і асвячалася на нябачных шляхах узыходжання, вышынях народнага Духу. Нескаронасць беларускага Духу спраўджвалася ў разуменні неабходнасці пакут і выпрабаванняў для ачышчэння, набліжэння да светлай жыццёвай радасці. Нездарма славуты першадрукар, пісьменнік, філосаф-багаслоў Францыск Скарына, у нечым атаясамліваючы сябе з прамудрым Саламонам, пісаў: “Не просил еси собе дней многых, ни богатства, ниже душ врагов…, но жадал еси собе только мудрости”.

Так, не плоць, дух патрабуе ацалення ў сённяшняй рэальнасці. Не выпадкова як да гаючай наталяльнай крыніцы звяртаемся мы ўсё часцей і часцей да духоўных светачаў нашай Айчыны Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Францыска Скарыны, да іх духоўнага подзвігу, да іх духоўнага вопыту ратавання нораваў свайго часу.

Свяціцель Дзімітрый Растоўскі згадваў, што Гасподзь адкрыў праз св. Варвару[1] (саму святую і яе мошчы ён асабліва ўшаноўваў) яго кароткі век і спытаў: жадае ён спакойнага праведнага жыцця ці дзейнаснага падзвіжніцтва. Старабеларускі святы абраў апошняе. Тады яму было адкрыта, што найперш патрэбна сцяжаць мужнасць. Дарэчы, пасля паглыбленага азнаямлення з старабеларускай гісторыяй XVII ст., асабліва старабеларускім уплывам на расійскую культуру, А.М.Адамовіч неаднойчы адзначаў, што сучасная Беларусь згубіла 11 запавет, здабыты продкамі, – неабходнасць духоўнай мужнасці.

Аднак ужо ў 90-я гады назіраецца выхад айчыннай медыявістыкі з “пракрустава ложа”, калі замоўчваліся багаслоўскія погляды, экзэгетыка-тэалагічныя распрацоўкі сярэдневяковых пісьменнікаў.

Хаця, як адзначае Сымон Франк у сваёй кнізе “Сэнс жыцця” (1925), уся філасофія, усвядоміўшая сама сябе і свой прадмет, ад старажытных грэчаскіх мудрацоў да найноўшай філасофіі нашых дзён, з'яўляецца філасофіяй рэлігійнай, і мэта яе – адшуканне і свядомае абгрунтаванне духоўных першаасноў быцця [2].

Дз.С.Ліхачоў пісаў, што “ў сярэдневяковай кніжнасці нельга адарваць царкоўныя матэрыялы ад свецкіх. Так ці іначай царкоўныя творы звязаны са свецкай гісторыяй, а свецкія помнікі ў той ці іншай

---

[1] Згодна Царкоўнага Падання, малітоўны зварот да Св. Варвары зберагае ад нечаканага адыходу без споведзі і прычашчэння св. Хрыстовых Тайнаў.

[2] Смысл жизни: Антология. – М., 1994. – С. 491 – 583.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступені царкоўныя, бо адлюстроўваюць рэлігійныя асновы сярэдневяковага светапогляду" [3].

Для беларускай культуры XV – XVII стст. характэрны росквіт марыялогіі. Старажытная Русь здаўна лічылася Домам Прасвятой Багародзіцы. Польскія каралі і вялікія князі літоўскія называлі і каранавалі Божую Маці пачэснай каралевай і вялікай княгіняй, у лёсавызначальныя моманты сваёй гісторыі аддавалі сябе пад Пакроў і Апеку Царыцы Нябеснай. Першыя пісьмова занатаваныя багамольскія і лірніцкія песні прысвечаны менавіта гэтаму культу. Сярод лепшых твораў старабеларускай гамілетыкі шмат высокадасканалых экзэгезказанняў на Багародзічныя святы. На працягу ўсёй гісторыі існавання старабеларускай народнасці для духоўнай падтрымкі ў цяжкія часы нацыянальнага жыцця былі яўлены цудадзейныя іконы Божай Маці. Здараліся часы, калі беларускі народ страчваў сваю дзяржаўнасць, традыцыі літаратурнай мовы, але сярод вызначальных рыс яго архетыпу спрадвеку было ўсынаўленне ў Госпадзе і Божай Маці. Менавіта Багародзіца стала пасрэдніцай паміж сакральнымі законамі светабудовы і падараваным чалавецтву праз Хрыста /Логаса/ словам Божай ісціны.

Як адзначае Н.Б.Мячкоўская, кніжнікі Сярэднявечча бачылі ў філалагічнай вучонасці ключ да пазнання таямніц быцця, запісаных у святых тэкстах.[4] Дз.С.Ліхачоў, згадваючы пра дзейнасць балгарскага пісьменніка XV ст. Канстанціна Касцянецкага, пісаў, што зразумець рэч – гэта правільна яе назваць. Пазнанне для яго (г. зн. Касцянецкага), як і для многіх багасловаў Сярэднявечча, – гэта адлюстраванне свету сродкамі мовы. Слова і сутнасць для яго непарыўныя... Адсюль яго неспакой аб кожным выпадку разыходжання паміж імі, якое можа атрымацца ад няправільнага напісання, ад няправільнай формы слова. А гэтыя разыходжанні, у сваю чаргу, могуць прывесці да ерасі, ці ва ўсякім выпадку да памылковых поглядаў, няправільнага светаўспрымання[5]. Таму, як вынікае, паміж мовай і пісьменствам, з аднаго боку, і з'явамі свету – з другога, існавала арганічная сувязь. Такім чынам, сярэдневяковае пісьменства вызначалася, акрамя цэласнасці філалагічных ведаў, арганічнай спалучанасцю філалогіі і спадарожных тэалагічных дысцыплін: экзэгетыкі, герменэўтыкі, марыялогіі і інш.

---

[3] Лихачев Д.С. Текстология на материале русской литературы X – XVII веков. – Л., 1983. – С. 114.

[4] Мечковская Н.Б. Ранние восточнославянские грамматики. – Мн., 1984. – С. 18.

[5] Лихачев Д.С. Исследования по древнерусской литературе. – Л., 1986. – С. 20.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Плённас вырашэнне шматлікіх антынамічных праблем пісьменства Новага часу запатрабавала пераадолення ўяўлення аб перарванасці нацыянальных традыцый, ізаляванасці старажытнага і новага ў айчыннай філалогіі, сцвярджэння арганічнай паяднанасці старабеларускага і сучаснага перыядаў бытавання літаратуры і культуры ўвогуле. Новыя рэаліі культурна-грамадскага жыцця ўладна запатрабавалі азнаямлення шырокіх колаў айчынных і замежных чытачоў з феноменам “залатога веку” старажытнай літаратуры, калі здабыткі беларускай кніжнасці плённа засвойвалі не толькі славянскія народы, але і жыхары Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Паводле архіўных звестак, марыялагічныя творы былі бадай што самымі папулярнымі сярод твораў айчыннай кніжнасці.

Даследаванне працэсу фарміравання менталітэту і светапоглядных асаблівасцей беларускай нацыі немагчыма без увядзення ў актыўны культурны ўжытак гамілетыка-марыялагічнай, экзэгетыка-герменэўтычнай, лексіколага-граматычнай і паэтыка-драматургічнай спадчыны, багатай харызматычнай і тэургічнай культуры, якая бярэ свой пачатак яшчэ з часоў духоўнага старабеларускага Адраджэння.

Усе катаклізмы, перыядычныя заняпады ў развіцці беларускай кніжнасці маюць свае карані ў адхіленні нашага этнасу ад класічнага, Богам натхнёнага шляху развіцця, калі ў аснову ўсяго народнага існавання была пакладзена духоўнасць як неабходны і жыццядайны першапачатак.

Асабліва ўласцівыя старабеларускаму народу хрысціянскія пачуцці міласэрнасці і любові, цярпення і пакут праз усынаўленне ў Госпадзе спрыялі фарміраванню высокадасканалага этнасу, мову, пісьменства і культуру якога плённа запазычвалі славянскія і заходнееўрапейскія народы, вучыліся ўдаламу вопыту гарманічнай спалучанасці кананічнага і свецкага ў справе ўпарадкавання нацыянальнай літаратурнай мовы.

На канец XVI – XVII ст. прыпадае росквіт гамілетычнай марыялогіі, асабліва ў творчасці Іаанікія Галятоўскага, Лявонція Карповіча, Дзімітрыя Растоўскага, Лазара Барановіча, Інакенція Гізеля, Кірылы Транквілёна-Стаўравецкага, Сімяона Полацкага, пазней Стэфана Яворскага і Георгія Каніскага.

Па словах свяціцеля Дзімітрыя Растоўскага[6], Багародзіца была дачкою Бога Айца Саваофа, Маці Бога Сына Ісуса Хрыста і Нявестаю Духа Святога Суцяшальніка. Духу Святому Яна

[6] Избранные проповеди святых отцов церкви и современных проповедников. – СПб., 1912. – С. 250 – 251.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паслужыла дзявочай цнатлівай чысцінёй, Богу Сыну – змірэннем, вернасцю, Богу Айцу – любоўю. Пасля аддання Яе Богу бацькамі святымі праведнікамі Іаакімам і Ганнаю Багародзіца не ўяўляла сябе жонкаю смяротнага зямнога чалавека, такім чынам не парушыла дзявоцкай чысціні ні цялесна, ні духоўна. Яна ўзыходзіла да ўнявешчвання Святым Духам юначай чысцінёю, стала Жывою Царквою і Адухоўленым Храмам, бо, па сведчанні Святых Айцоў, дзявоцтва роднаснае ангельскаму чыну і асабліва ўлюбёнае Богам.

Праз змірэннае нясенне нятленнага мацярынства, выхаванне-спасціжэнне, духоўнае ўкрыжаванне разам са Сваім Сынам Дзева Марыя ўзведзена на Прастол Нябеснага Царства, стала вышэйшай за Херувімаў і Серафімаў. І апошняя ступень узыходжання Багародзіцы – узыходжанне любоўю-агапіяй да Бога Айца Саваофа праз гэты найвялікшы дар у Сусвеце. Яе глыбінная, патаемная любоў "усім сэрцам, усёй душою, усім памышленнем" зрабіла Дзеву Марыю з рода Давідавага найвышэйшай сярод усіх зямных і створаных істот. Менавіта Яе любоў у полымі лагоднай рэўнаснай чысціні належала ўсім асобам Прасвятой Тройцы. Але Сваёй найвялікшай міласэрнасцю Царыца Нябесная ахоплівае ўвесь Сусвет, увесь род хрысціянскі, які шчыра ўшаноўвае Яе, няспынна просіць Яе дапамогі і падтрымкі ў малітвах.

У казанні на свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы Дзімітрый Растоўскі[7] параўноўвае Царыцу Нябесную з Ноевым Каўчэгам, што ратуе нас ад патопу вогненнага ўласных грахоў і прасцінае над намі амафор міласэрнасці Сваёй. Правобразныя параўнанні Божай Маці з галубіцаю маслічнаю з Ноевага Каўчэга ("вярнулася да Ноя галубіца і мела галінку маслічную ў вуснах сваіх", с.143) змяшчае архіепіскап Лазар Барановіч у "Слове пятым на Благавешчанне" (кніга "Меч духоўны"), "галубіцаю" называе Багародзіцу і Сімяон Полацкі ў "Слове другім на Успенне Прасвятой Багародзіцы" ("Вячэра духоўная", с.450). Божая Маці сваім жыццём заклікае нас прыпадобніцца насельнікам Ноевага Каўчэга лагодай, змірэннем і міралюбствам, калі леў клапаціўся пра аленя, ястраб пра голуба, воўк пра авечак, мядзведзь пра кароў, бо перамогшы злое ў сабе, кожны хрысціянін гэтым і набліжаецца да Царства Вечнага.

У адпаведнасці з анталагічнымі поглядамі на сакральную (у тым ліку дзяржаўную) гісторыю сярэдневяковы чалавек бачыў прычыну грамадскіх катаклізмаў (згодна формуле ens et bonum conventur)[8] ва

---

[7] Творенія иже во святыхъ отца нашего Св. Димитрія Ростовского. – СПб., 1912. – Ч. 2. – С. 765 –767.

[8] Быццё і дабро ў Сусвеце непераможныя. Бог ёсць дабро і быццё Сусвету, бо ім усё створана. Зло ёсць небыццё, ірэальнасць, бо жыве за кошт дабра, і ў



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

уласнай грахоўнасці і ў адыходзе ад запаведаных хрысціянскай традыцыяй духоўных асноў жыцця, таму і звяртаўся за дапамогай да Госпада, да Маці Божай, Нябеснай Хадайніцы і Заступніцы за род хрысціянскі.

Паводле святаайцоўскага вучэння, Багародзіца, Прыснадзева Марыя – найвышэйшая са створаных разумных істот, непараўнальна вышэйшая за самых высокіх Анёлаў, Херувімаў, Серафімаў, непараўнальна вышэйшая за ўсіх святых падзвіжнікаў. Яна Уладычыца і Царыца ўсяго створанага, зямнога і нябеснага. Яна Прыснадзева, г. зн. да нараджэння Ёю Богачалавека – Дзева, у нараджэнні Яго – Дзева, і па нараджэнні Яго – Дзева. Нездарма імя Марыя дадзена Ёй па загадзе Божым і значыць Гаспажа /Панна/ [9].

У "Казанні другім на Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы" ("Ключ разумения", Львоў, 1665) славуты старабеларускі красамоўца Іаанікій Галятоўскі, услед за Айцамі Царквы, параўноўвае Божую Маці з Новым Небам і заклікае шчырых вернікаў быць аблокамі вакол Яе. Паводле праваобразнага тлумачэння сярэдневяковых экзэгетаў, вылучаецца 11 Нябёсаў – 11 ступеняў узыходжання да Прастола Цара Нябеснага, і на кожным з іх мае асаблівую ўладу Дзева Марыя.

Сімяон Полацкі ў "Слове другім у Дзень Успення Прасвятой Багародзіцы" ("Вячэра духоўная", с. 452) прамаўляе праз зварот да старазапаветных праваобразаў: "возставши Маріамъ отиде в горняя со тщаніемъ, на гору небесную, во градъ Царя всѣхъ вѣковъ. Идетъ іако Савская оная Царица к Соломону... Окресть обыдоша Престолы, Херувімы и Серафімы, купно со праведныхъ душами святыми... провождаютъ Царицу ко Царю къ Соломону истиннейщему, съ неоцѣннымъ злата мысленнаго сокровищемъ, еже есть к Богу: съ неизчетным множеством честныхъ камней, еже есть всяческихъ добродѣтелей".

У канклюзіі "Слова другога ў Дзень Нараджэння Прасвятой Багародзіцы" ("Вячэра духоўная", с. 482) Сімяон Полацкі разгортвае папярэдняе прашэнне: "Тѣмжэ къ Ней, яко Присномилосердной Матери, дерзновенно, купно и надеждно вси православніи хрістіане съ теплыми молитвами, со усердными слезами да притекаемъ кождо моля о исполненіе требованія своего:

вынікў перамагаецца дабром, і не ў стане адолець яго. Такім чынам, вызначальнай асаблівасцю сярэдневяковай філасофіі быў аптымізм светабачання.

[9] Брянчанинов Игнатий. Изложение учения православной церкви о Божией Матери. – Радонеж, 1990. – С.2; Блаж. Архиепископ Иоанн (Максимович). Православное почитание Божией Матери. Вильмуассон. – СПб., 1992.

изряднѣе же вси единѣми оусты и единѣмъ сердцемъ да молимъ благоутробїе Ея, да потщится оумолити Сына Еи и Бога, еже дати Ему намъ оставленїе грѣховъ, изобилїе плодовъ, миръ, тишину, благополучїе и вѣчныхъ благъ того благодатїю и чѣловеколюбїемъ сподобитися".

Сваёй нячутнай чалавечаму вуху малітвай Божая Маці, як гіганцкая свяча, гарыць да Неба хадайніцтвам за знявечаны грахамі род чалавечы. Яе мацярынскае сэрца праз унутранае гарэнне "ў Бозе" становіцца ў акце Боганараджэння "Сэрцам Сусвету"[10], радасцю кожнай сатворанай істоты ў адухоўленым храме любові. Такі іканаграфічны сюжэт Пухлаўскай цудадзейнай іконы Багародзіцы.

Прасвятая Багародзіца, як пасрэдніца паміж намі і Богам, не дапушчае, каб грахі нашыя, калі праходзяць перад Госпадам, адразу ж былі аддадзеныя на разгляд, а сілай уласнай малітвы вымольвае дараванне нават і грахам смяротным. Царыца Нябесная сумясціла ў Сабе моц жанчыны і глыбіню ісціны. Яе моц не толькі ў доўгацярпенні крыўдаў і азлаблення, але і ў перамозе іх веліччу ўласнага Духу. Відаць, у гэтым пазней многія святыя знаходзілі сілу для супрацiўлення духоўнаму прымусу да крыві, нават былі згодныя хутчэй адпакутаваць і памерці, чым здрадзіць веры, апаганіць яе свецкімі жарсцямі і здабыткамі.

Згодна старадаўняй земляробчай традыцыі, святціель Дзімітрый Растоўскі параўноўвае славянства з беднаю віфліемскаю ўдавіцаю Руф'ю, што збірае ў свята Успення Прачыстай калоссе міласэрнасці, чысціні, мудрасці, лагоды і змірэння ў час урадлівых Ваозавых дажджынак. З першай баразны, па словах святціеля, збіраем мы калоссе Яе дзявочай цноты, бо Яна першай з жанчын навекі ахвяравалася Богу. З другой – збіраюцца каласы Яе незлаблівасці, бо "сміряяй себѣ вознесется", трэцяя баразна нясе серафімскую любоў Божай Маці да Госпада пасля Яго Уваскрэсення, чацвёртая і пятая барозны адлюстроўваюць клопаты і абарону хрысціян Прачыстай ва ўсе часы.

Праз усю паліфанію праяў жыцця Францыск Скарына праводзіць ледзь не фатальны тэзіс, цытуючы Эклезіяст: "Суета над суетами и все суетно и утиснение духово".

Яго тэзіс разгортвае Дзімітрый Растоўскі ў "Павучэнні на свята Прачыстыя Багародзіцы Смаленскія, імем Адзігітрыя, месяца ліпеня ў 28 дзень": "Усялякая радасць свету гэтага ёсць смутак; і няма тут такой радасці, якая б не змянялася смуткам; няма ўцехі, якая б не

[10] Трубецкой Е.Н. Избранное. – М., 1995. – С. 368.

спалучалася з жалем; няма весялосці, за якою б не ішла туга; няма смеху, які б не суправаджаўся плачам з уздыханнем; няма дабра, якое не скончылася б злом. І як жа можа свет гэты тварыць каму-небудзь дабро, калі па прыродзе сваёй ён нясе зло? Кахай яго, а ён цябе зненавідзіць; шукай яго, а ён ад цябе бяжыць; служы яму, а ён цябе б'е; улагоджвай яго пахвальбою, а ён цябе абражае; спадзявайся на яго, ён жа ва ўсім цябе падмане. Абяцае табе павагу, а дасылае зневажэнне; абяцае золата, а кідае ў бруд; абяцае багацце, але і апошняе адбірае ў цябе; абяцае мёд, а дае жоўць; абяцае асалоду, а працінае горыччу; абяцае хлеб, а ў хвіліны нястачы абарочваецца каменнем; абяцае добрае, а адплочвае злым. Такім чынам, няма ніводнага сапраўднага суцяшэння і радасці ў свеце гэтым. Усё перапоўнена скаргамі і плачам!" [11]

Сапраўднае суцяшэнне і спагаду нясе Прасвятая Уладычыца, нездарма імянуе Яе Царква "раем слоўным, Адзігітрыяю ў рай рэчыўны". Нам можа здацца цнота і чысціня Царыцы Нябеснай недасягальна далёкімі, але Яна са Сваім святым Сынам увесь час няспынна грукаюцца ў зачыненыя дзверы нашых сэрцаў. І калі Мы, як евангельская блудніца, шчыра ўсвядомім грахоўную бездань нашага жыцця, то, паводле Іаана Златавуснага, станем, як апосталы і праведнікі, братамі і сёстрамі Хрыстовымі, усыноўленымі і ўдачэранымі Царству Слова.

Дзева Марыя набліжае нас да праведнага жыцця па Сваім глыбокім змірэнні, нават не словамі, але справамі ўласнымі, прыкладам вечнадзявочай цноты і чысціні, якія ўзгадаваліся ў алтары Святога Святых Храма, куды ўваходзілі толькі ангельскія чыны, святары і прарокі. Як праведны Лот у нечасцівым горадзе захоўваў дабрачыннасць, спавяданую Аўраамам, так і Прачыстая Дзева захавала цнатлівую святасць, як "ружа сярод церняў", як незласлівы, лагодны, чысты Агнец, чым і ўзвысілася над усімі стварэннямі зямнымі і нябёснымі.

Старабеларускае духоўнае Адраджэнне, сцвярджэнне ідэі Вільні як Трэцяга Рыма спрыяла не толькі росквіту іканапісання, але і асабліваму ўшанаванню ікон Божай Маці ў тым ліку.

І калі ў Расіі мяжы XVI – XVII ст., "смутныя часы", апрычніна спрыялі заняпаду царкоўнага жывапісу, на землях Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай падзеі рэлігійна-дзяржаўных катаклізмаў абудзілі развіццё іконапісу, марыялагічнай кніжнасці, на думку многіх славянскіх багасловаў, найбагацейшай у свеце.

---

[11] Проповеди и поучения святителя Димитрия Ростовского. – СПб., 1912. – Ч. 2. – С. 652.